

БУРА НАРАБІЛА БЯДЫ 3

ПАМЯЦЬ ПА КОЖНЫМ ТРЭЦІМ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

21 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 120 (30254)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПАРХОМЧЫК, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Якасць — найважнейшы прыярытэт эканамічнай палітыкі любой дзяржавы. Для нашай краіны, дзе больш як 50 працэнтаў аб'ёмаў вытворчасці рэалізоўваецца на экспарт, якасць — надзейны фундамент для забеспячэння канкурэнтаздольнасці тавараў, што выпускаюцца, і пазнавальнасці на міжнародных рынках. Сёння нацыянальны брэнд «Зроблена ў Беларусі» вядомы і запатрабаваны ў больш як 160 краінах».*

# Заўсёды па дарозе



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Таццяна і Яўген БУДЗЬКО працуюць як напарнікі на адным сталічным электробусе ў аўтобусным парку № 5 ужо тры гады. Таццяна да гэтага доўгі час вадзіла па мінскіх вуліцах тралейбус. Дарэчы, пазнаёміліся сужэнцы на тралейбусным прыпынку: Таццяна была на маршруце, а Яўген зайшоў як пасажыр. Разам яны ўжо 18 гадоў, выхоўваюць траіх дзяцей. Адна дарога на дваіх, прычым літаральна, — гэта пра іх.**

## КОРАТКА

- **З 22 прадпрыемстваў — пераможцаў конкурсу на саісканне прэміі СНД 2023 года за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг дзевяць — беларускія.**
- Міндукацыі: у каледжах могуць быць прадоўжаны тэрміны прыёму на ўзровень прафтэхадукацыі.
- **ЕАБР чакае рост ВУП Беларусі на 3,4 працэнта па выніках года.**
- У НАН распрацавалі першы айчынны інтэрактыўны калькулятар фізразвіцця і харчавання дзіцяці.
- **У Гродне адкрылі мемарыяльную дошку ў памяць аб закатаваных у гады ВАВ вязнях мясцовай турмы.**
- У парадзе на 3 ліпеня прымуць удзел 36 парадных разлікаў, з іх — дзевяць замежных.
- **Зборная Беларусі займае 98-е месца ў рэйтынгу ФІФА.**
- Каля 2,5 мільёна беларусаў сістэматычна займаюцца фізічнай культурай і спортам.

Спажывец

## СТРАТЭГІЧНЫ ПРАДУКТ

### Такое рознае малако... Каму якое падыходзіць?

**Беларусь у ліку сусветных лідараў па вытворчасці малака на душу насельніцтва: узровень самазабеспячэння гэтым прадуктам у нашай краіне — больш за 260 %. Асартымент малочнай прамысловасці складае больш за 1800 найменняў прадукцыі: што датычыцца «малочкі», беларускія харчавікі гатовы прапанаваць спажыўцу ўсё, чаго толькі душа пажадае.**

У нашым дзяцінстве малако было адно. Адрозніваліся яно пакаваннем, і варыянтаў было два: у бутэльцы ці ў пакеце. Сёння асартымент пітнога малака велізарны: безлактознае, з павышаным утрыманнем бялку, малако А2, для дзіцячага харчавання, з розным працэнтам тлустасці і рознымі тэмпературнымі апрацоўкамі... Чаму ў наш час узнікла неабходнасць у такой дэталізацыі? І як не згубіцца ў гэтым моры прапановы?



СТАР. 13

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ 1943-1944

## 37 тысяч лёсаў за незалежнасць



**На пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў баях пад Оршай і Рудняй Смаленскай вобласці ўпершыню былі выкарыстаны рэактыўныя ўстаноўкі БМ-13 — легендарныя «Кацюшы». У акупаваным горадзе змагаліся з ворагам больш за дваццаць груп падпольшчыкаў, у ліку іх — група пад кіраўніцтвам Канстанціна Заслонава, якая дзейнічала на чыгуначным вузле. 27 чэрвеня 1944 года ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а доўгачаканых вызваліцеляў сустракалі на руінах тры тысячы аршанцаў. Дзякуючы гераізму і мужнасці савецкіх байцоў, 37 тысяч з якіх знайшлі вечны прытулак на аршанскай зямлі, Орша стала адным з трох беларускіх гарадоў, узнагароджаных ордэнам Айчыннай вайны I ступені.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

24120

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Устойлівы рост дабрабыту і павышэнне якасці жыцця

## Старшыня Праўлення Нацбанка і віцэ-прэм'ер, адказны за сацыяльную сферу, расказалі аб выніках дзейнасці за мінулы год і аб задачах, запланаваных на год бягучы

**Падчас сумеснага пасяджэння дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі кіраўнік Нацбанка Павел Калаур і намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка выступілі з дакладамі і адказалі на пытанні парламентарыяў. Такая форма работы закладзена абноўленай Канстытуцыяй.**

### Цэнавая стабільнасць

**Кажучы аб забеспячэнні цэнавой стабільнасці, Павел КАЛАУР адзначыў, што ўзгодненыя дзеянні Нацыянальнага банка і ўрада Беларусі абумовілі выкананне мэтавага параметра па інфляцыі.**

«Прырост спажывецкіх цэн за 2023 год склаў 5,8 % пры мэтавым арыенціры 7-8 %, — канкрэтызаваў ён. — Пры гэтым цэны і тарыфы, якія ўваходзяць у разлік базавай інфляцыі, за год прыраслі на 3,8 %. Аператыўнае выкарыстанне нестандартных інструментаў і настроек, нароўні з класічнымі, дало магчымасць абмежаваць націск праінфляцыйных фактараў і павысіць эфектыўнасць рэагавання на знешнія выклікі. Замаруджванню інфляцыі таксама садзейнічала сістэма рэгулявання цэн, укаранёная ўрадам Беларусі ў кастрычніку 2022 года. Яна абмежавала практыку ўліку ў цэнаўтварэнні неапраўдана завышаных рызык і выдаткаў».

Сёлета пераемнасць грашова-крэдытнай палітыкі захоўваецца. Гадавы прырост спажывецкіх цэн у маі бягучага года склаў 5,7 %, базавай інфляцыі — 4,5 %.

### Давер да нацвалюты расце

Як звярнуў увагу Павел Калаур, умераная інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў, а таксама ўстойлівасць абменнага курсу садзейнічалі ўмацаванню даверу да нацыянальнай валюты як да сродку зберажэння. «За пяць месяцаў 2024 года тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва павялічыліся на 12,2 %, — паведаміў ён. — Пры гэтым захоўваецца цікавасць насельніцтва да рублёвых зберажэнняў на працяглыя тэрміны. Доля доўгатэрміновых дэпазітаў на 1 чэрвеня склала 60 %. Такая дынаміка павышае ўстойлівасць банкаў, іх рэсурсны патэнцыял і пашырае магчымасці па фінансаванні эканомікі».

Актыўнае ўкараненне інавацый дае магчымасць беларускім банкам адпавядаць сучасным патрабаванням, падтрымліваць сваю канкурэнтаздольнасць на знешніх рынках і пашырае магчымасці па ўзаемадзеянні з банкамі-партнёрамі з дружалюбных краін. Адначасова гэта садзейнічае павышэнню якасці паслуг, увядзенню новых сэрвісаў і прадуктаў, у тым ліку праз дыстанцыйнае абслугоўванне.

### Безнаяўны разлік і кібербяспека

На 1 студзеня 2024 года колькасць выпушчаных у абарачэнне банкаўскіх плацежных картак перавысіла 19 мільёнаў адзінак. Пры гэтым колькасць картак БЕЛКАРТ у абарачэнні павялічылася за год на 23 %. Актуальнасць і запатрабаванасць паказаў інстытут базавых рахункаў, які дае набор бясплатных аперацый нашым грамадзянам. З мэтай зніжэння выдаткаў арганізацый гандлю на прыём безнаяўных плацяжоў большасць банкаў прапануюць кліентам магчымасць іх ажыццяўлення з дапамогай мабільнага дадатку з выкарыстаннем QR-кодаў. Праведзенне такіх плацяжоў не патрабуе наяўнасці банкаўскай плацежнай карткі. Пры гэтым у аснове тэхналогіі ляжаць айчынныя распрацоўкі. У 2023 годзе забяспечана далейшае развіццё сістэмы імгненных плацяжоў. Цяпер фізічным асобам сталі даступны пераводы па нумары тэлефона, у тым ліку трансгранічныя.

Павел Калаур канстатаваў, што павышэнне інавацыйнасці фінансавага сектара суправаджаецца ростам кіберзлачынстваў. «Асноўная іх частка звязана з сацыяльнай інжынерыяй, калі грамадзяне самі даюць зламыснікам інфармацыю для доступу да сваіх рахункаў, — удакладніў ён. — У сувязі з гэтым на працягу мінулага года Нацыянальным банкам сумесна з праваахоўнымі органамі працаягнута шырокамаштабнае інфармаванне насельніцтва аб сучасных метадах і спосабах учынення кіберзлачынстваў, мерах па іх прафілактыцы. Уступленне ў сілу Указа Прэзідэнта «Аб кібербяспецы» і загада Аператыўна-аналітычнага цэнтра аб мерах па яго рэалізацыі рэгламентавалі стварэнне нацыянальнай сістэмы кібербяспекі. Па ініцыятыве Нацыянальнага банка прынятыы Указ Прэзідэнта «Аб мерах па процідзеянні несанкцыянаваным плацежным аперацыям». Указ вызначае парадак узаемадзеяння Нацыянальнага банка з праваахоўнымі органамі і пастаўшчыкамі плацежных паслуг па абмене інфармацыяй аб інцыдэнтах, што заклікана аператыўна і дзейсна рэагаваць на злачынствы, якія здзяйсняюцца, і кіберпагрозы ў фінансавай сферы, якія ўзнікаюць».

У яго развіццё Нацыянальным банкам былі прыняты рашэнні, якія вызначаюць крытэрыі падазроных аперацый і дзеянняў для іх прыпынення. У выніку запуску названага механізму за перыяд з сакавіка па май 2024 года беларускімі банкамі прыпынены пераводы грашовых сродкаў на суму Br2,7 мільёна, тым самым прадухіліўшы іх крадзеж.

### Стабільнасць даходаў і ўстойлівы курс

«Забеспячэнне цэнавай і фінансавай стабільнасці ў сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве з'яўляецца найважнейшай умовай для ўстойлівага развіцця краіны, што дае магчымасць забяспечыць стабільнасць пакупной здольнасці даходаў і зберажэнняў грамадзян, устойлівасць абменнага курсу беларускага рубля, нізкія працэнтныя стаўкі ў эканоміцы, давер да нацыянальнай валюты і больш высокую схільнасць да зберажэнняў у беларускіх рублях, рост доўгатэрміновых рэсурсаў у эканоміцы і ўзрастанне іх ролі ў інвестыцыйных працэсах», — адзначыў кіраўнік Нацбанка.

Працэнтная палітыка захавае накіраванасць на забеспячэнне прывабнасці зберажэнняў у нацыянальнай валюце, будуць прыняты меры па развіцці доўгатэрміновага дэпазітнага рынку, а таксама па павелічэнні долі рублёвых зберажэнняў.

«У 2024 годзе працягнецца ўдасканаленне сістэмы абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг, у тым ліку яе прававога рэгулявання са спажыўцамі, — адзначыў Павел Калаур. — Лічу, што паспяховая рэалізацыя Нацыянальным банкам усіх запланаваных мер будзе садзейнічаць фарміраванню ўмоў для ўстойлівага росту дабрабыту і павышэння якасці жыцця насельніцтва».

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА выступіў перад парламентарыямі з дакладам «Сацыяльная сфера як індыкатар якасці жыцця насельніцтва», у якім закрануў усе аспекты сучаснага беларускага соцыуму. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што выверaная сацыяльная палітыка на сацыяльным этапе выступае гарантам стабільнасці і ўстойлівага развіцця нашай дзяржавы, якая ў поўным аб'ёме выконвае ўсе ўзятыя на сябе сацыяльныя абавязацельствы і гарантыі перад насельніцтвам.**

### Звыш 31 мільярд — на сацыяльную сферу

Надзейную аснову сацыяльна арыентаванай палітыкі, якая праводзіцца, забяспечвае высокі ўзровень дзяржаўных расходаў на гэтыя мэты. «У апошнія гады яны складаюць не менш як 12 % ВУП, — канкрэтызаваў віцэ-прэм'ер. — У 2023 годзе на фінансаванне сацыяльнай сферы накіравана 27 мільярдаў бюджэтных сродкаў. У бягучым годзе расходы перасягнуць 31 мільярд беларускіх рублёў».

Ігар Петрышэнка расказаў, што тэмп росту рэальных даходаў насельніцтва ў мінулым годзе склаў 106,3 %. У бягучым годзе станоўчая дынаміка захоўваецца, у тым ліку ў галінах бюджэтнай сферы. «Разлічваем па выніках года забяспечыць рост заработнай платы бюджэтнікаў не менш як 16 % у намінальным выяўленні, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — З мэтай дасягнення параметраў пяцігодкі разам з планавым павышэннем базавай стаўкі ўведзены шэраг дадатковых галіновых стымуляцыйных выплат асобным катэгорыям супрацоўнікаў: настаўнікам, урачам, выхавацелям, работнікам культуры і сацыяльнай сферы».

«Летась мы змаглі забяспечыць самы высокі за апошнія чатыры гады тэмп росту рэальных даходаў пенсіянераў — каля 111 %, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — У лютым гэтага года праведзены чарговы пераразлік працоўных пенсій — на 10 %. У выніку сярэдні памер пенсіі ў непрацоўнага пенсіянера ў маі склаў каля 800 рублёў. Рашэнне аб далейшым павышэнні пенсій будзе прымацца з улікам даходнай часткі бюджэту Фонду сацабароны і, перш за ўсё, зыходзячы з павелічэння ў краіне ўзроўню заработнай платы. Думаю, што па выніках бягучага года рост пенсіённых выплат складзе не менш як 15 %».

Нароўні з дзяржаўнай пенсіяй важным кампанентам з'яўляецца развіццё сістэмы добраахвотнага назапашвальнага пенсіённага страхавання. Ігар Петрышэнка расказаў, што з моманту ўвядзення новай праграмы пенсіённых назапашванняў з фінансавай падтрымкай дзяржавы (так званая праграма «тры плюс тры») за паўтара года яе ўдзельнікамі сталі звыш 30 тысяч чалавек. «Тут разлічваем на больш высокую дынаміку ў будучыні», — паведаміў ён.

### Сямейны капітал атрымалі 137 тысяч шматдзетных сем'яў

«Сістэмай дзяржаўных дапамог у краіне ахоплена каля 372 тысяч дзяцей, — канстатаваў віцэ-прэм'ер. — На гэтыя мэты ў бягучым годзе будзе накіравана каля 3,5 мільёна рублёў».

Акрамя таго, з мэтай павышэння сацыяльнай абароненасці асобных катэгорый сем'яў і ўзмацнення адраснасці выплат урадам падрыхтаваны шэраг заканадаўчых ініцыятыў, якія прадугледжваюць павелічэнне мінімальнага памеру дапамогі па цяжарнасці і родах (для жанчын, якія атрымліваюць адукацыю і пачынаюць працоўную дзейнасць) і дапамогі па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці (для маладых спецыялістаў), а таксама ўзмацненне мер падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда. Віцэ-прэм'ер папрасіў дэпутацкі корпус у сціслыя тэрміны завяршыць работу над адпаведным законапраектам.

Ігар Петрышэнка нагадаў, што амаль дзесяць гадоў у нашай краіне дзейнічае праграма сямейнага капіталу. «Яе галоўны вынік — стабільны рост колькасці шматдзетных сем'яў, — падкрэсліў намеснік кіраўніка ўрада. — Калі на 1 студзеня 2020 года іх было 104 тысячы, то сёння ўжо больш як 123 тысячы. Пры гэтым з 2009 года колькасць такіх сем'яў павялічылася ў два разы. Усяго ў рамках рэалізацыі праграмы сямейны капітал прызначаны 137 тысячам шматдзетных сем'яў, на іх дэпазітныя ўклады залічана каля 4 мільярдаў рублёў».

Па словах віцэ-прэм'ера, самым запатрабаваным кірункам выкарыстання гэтых сродкаў з'яўляецца паляпшэнне жыллёвых умоў. Толькі за мінулы год 10 тысяч сем'яў змаглі вырашыць такім чынам свае жыллёвыя пытанні. Улічваючы, што ў бягучым годзе праграма сямейнага капіталу завяршаецца, ва ўрадзе прапрацоўваюцца канцэптуальныя прапановы па яе далейшым развіцці.

### Даступнасць сацыяльных паслуг

«З кожным годам усё больша ахоп атрымлівае аказанне сацыяльных паслуг і догляду ў звыклай для чалавека хатняй абстаноўцы, — адзначыў Ігар Петрышэнка. — У цяперашні час такія паслугі атрымліваюць звыш 62 % ад тых, хто ў гэтым мае патрэбу. Для якаснага і своечасовага аказання сацыяльнай падтрымкі, асабліва ў сельскай мясцовасці, развіваецца інфраструктура тэрытарыяльных цэнтраў. Летась адкрыты шэсць новых аддзяленняў, адзін філіял, восем сацыяльных пунктаў».

З 1 ліпеня бягучага года ўводзіцца шэраг навацый у гэтай сферы, накіраваных на павышэнне даступнасці сацыяльных паслуг шляхам увядзення дыстанцыйнай формы сацыяльнага абслугоўвання і арганізацыі падвозу атрымальнікаў сацыяльных паслуг у аддзяленне дзённага знаходжання. Увядзенне сістэмы доўгачасовага догляду дазваляе пажылым грамадзянам і інвалідам максімальна доўга знаходзіцца ў хатніх умовах».

### Клопат пра ветэранаў і інвалідаў

Матэрыяльную дапамогу да Дня Перамогі сёлета атрымалі амаль 8,5 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны на суму 10,5 мільёна рублёў», — паведаміў намеснік прэм'ер-міністра. У рамках падрыхтоўкі да святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на месцах праведзена работа па абследаванні матэрыяльна-бытавых умоў жыцця ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і іншых, прыраўнаваных да іх, катэгорый грамадзян. Усім ім аказана неабходная сацыяльна-бытавая дапамога, выкананы работы па забеспячэнні бяспечных умоў пражывання, вырашаны іншыя надзённыя пытанні.

Вядзецца мэтанакіраваная работа па павышэнні даступнага асяроддзя на аб'ектах жылога фонду і сацыяльнай інфраструктуры, стварэнні дадатковых магчымасцяў для рэабілітацыі і абілітацыі названай катэгорыі грамадзян, а таксама іх занятасці.

Выбудавана адзіная сістэма забеспячэння грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі. «Штогод такімі вырабамі забяспечваецца каля 60 тысяч чалавек, — удакладніў віцэ-прэм'ер. — Сёлета на гэтыя мэты прадугледжана больш за 50 мільёнаў рублёў. Усе патрэбы інвалідаў будуць задаволены своечасова і ў поўным аб'ёме».

### Пытанням медыцыны — пастаянная ўвага

«На ўмацаванне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы летась накіравана больш за 1 мільярд рублёў, — канкрэтызаваў Ігар Петрышэнка лічбы па гэтай сферы. — Адрамантавана 1500 ФАПаў, 480 амбулаторый урача агульнай практыкі, больш чым 140 участковых бальніц. Уведзены ў эксплуатацыю 26 новых аб'ектаў. У гэтым годзе плануецца завяршыць будаўніцтва яшчэ 15 аб'ектаў аховы здароўя. У рэгіёны таксама паступілі 25 айчынных перасовачных медыцынскіх комплексаў. Усяго іх у краіне задзейнічана ўжо 60. Разлічваем, што далейшае развіццё гэтага кірунку дазволіць істотна павысіць узровень і якасць аказання медыцынскай дапамогі ў сельскай мясцовасці».

Для прывядзення ўстаноў аховы здароўя ў адпаведнасць устаноўленым крытэрыям у бягучым годзе павінна быць завершана работа па іх медыцынскай акрэдытацыі. На асаблівым кантролі знаходзяцца і пытанні падрыхтоўкі, замацаванасці медыцынскіх кадраў. У гэтых мэтах пашыраны набор у медыцынскія ВНУ на бюджэтныя месцы, павялічаны аб'ёмы падрыхтоўкі мэтавікоў.

### Аптымальны варыянт выпускных іспытаў

Значныя намаганні ўрада сканцэнтраваны на вырашэнне пытанняў агульнай сярэдняй адукацыі. «З 1 верасня ў школах будуць вучыцца каля 1 мільёна 100 тысяч

навучэнцаў, з іх упершыню сядуць за парту каля 97 тысяч першакласнікаў», — паведаміў намеснік прэм'ер-міністра.

Кажучы аб прэтэнзіях да арганізацыі школьнага харчавання, Ігар Петрышэнка нагадаў, што летась урадам быў праведзены эксперымент па апрабацыі новых падыходаў. На дадзены момант іх выкарыстоўваюць каля дзвюх тысяч школ (гэта 80 % ад агульнай колькасці). Астатнія пяройдуць да іх прымянення з 1 верасня бягучага года.

Што датычыцца перафарматавання выпускных іспытаў у школе, віцэ-прэм'ер канстатаваў, што на дадзены момант цэнтралізаваны экзамен прайшоў арганізавана, без пазаштатных сітуацый. «У цэлым лічу, што такі фармат выпускных іспытаў аптымальны, што пацвярджаецца педагогамі, бацькоўскай грамадскасцю і самімі навучэнцамі», — падкрэсліў ён. Станоўчы эфект, па словах віцэ-прэм'ера, дало і праўядзенне ўступнай кампаніі па новых правілах.

### Дзеля культурнага імпартазамяшчэння

«Пашырэнне паслуг у сферы культуры і павышэнне іх якасці вядзецца паралельна з работай па захаванні нацыянальнай культурнай спадчыны, — адзначыў Ігар Петрышэнка. — У мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы аб распрацоўцы канцэпцыі культурнай імпартазамяшчэння пастановай урада зацверджана Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024—2026 гады. У ёй сістэматызаваны прынцыпы і механізмы гэтай дзейнасці, закліканай забяспечыць захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, рэалізацыю інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу нацыі, актыўнае ўцягванне грамадзян у культурнае жыццё нашай краіны».

Варта сёння гаварыць і пра інфармацыйнае імпартазамяшчэнне. «У грамадстве расце запыт менавіта на дакладную інфармацыю, якая якасна прадстаўляецца, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — І гэта трэнд глабальны. Дзяржаўныя СМІ, як традыцыйныя друкаваныя, так і электронныя, якія адказваюць рэаліям сённяшняга дня, пацвердзілі і ўмацавалі свой аўтарытэт як надзейнай крыніцы інфармацыі. Згодна са звесткамі сацыялагічных даследаванняў Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук, узровень даверу насельніцтва дзяржаўным СМІ ў мінулым годзе ў параўнанні з 2022-м вырас на 4,7 % і склаў 54,3 %. Менавіта тэлебачанне, газеты, радыё з'яўляюцца пастаўшчыкамі максімальна якаснага і праўдзівага кантэнту, у адрозненне ад розных рэсурсаў, якія літаральна перапоўнены і няпэўнымі, і адкрыта хлусліўымі, і фэйкавымі навінамі».

Рэзюмуючы, Ігар Петрышэнка падкрэсліў, што толькі дзякуючы згуртаванасці і яднанню ў грамадстве, нягледзячы на розныя выклікі, адкрыты прэсінг з боку шэрагу дзяржаў, наша краіна па-ранейшаму захоўвае курс на стабільнае развіццё без узрушэнняў і рызыкоўных эксперыментаў сацыяльных і эканамічных. «У цэнтры ўвагі застаецца чалавек, яго патрэбам служыла і будзе служыць дзяржава, — акцэнтаваў увагу ён. — Мы будуем, як неаднаразова падкрэсліваў кіраўнік дзяржавы, дзяржаву для народа. Таму прыярытэтам застаецца павышэнне якасці жыцця, укараненне ўсяго самага лепшага ў адукацыі, ахове здароўя, культуры, сацыяльнай абароне і іншых галінах сацыяльнай сферы».

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# Своечасовыя новаўвядзенні

## Сенатары адобрылі звыш 20 законапраектаў

**У прыватнасці, на чарговым пасяджэнні першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання разгледжаны праекты законаў Рэспублікі Беларусь «Аб амністыі ў сувязі з 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх», «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», «Аб змяненні законаў па пытаннях урэгулявання неплацежаздольнасці», ратыфікаваны шэраг міжнародных дакументаў.**

Прадстаўляючы законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», намеснік міністра ўнутраных спраў — **начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ** адзначыў, што законапраект распрацаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. «Адрозненнем бягучага законапраекта ад папярэдніх з'яўляецца тое, што вызваленыя па амністыі будуць максімальна ўцягнуты ў эканоміку краіны, — падкрэсліў ён. — Так, асуджаным у выглядзе грамадскіх работ, папраўчых работ, іншых мер крымінальнай адказнасці амністыя будзе прымяняцца толькі калі такія асобы на дзень разгляду матэрыялаў па працягу не менш як трох месяцаў працуюць, вучацца або займаюцца іншай дзейнасцю — лічацца занятымі ў эканоміцы ў адпаведнасці з заканадаўствам. Таксама ў законапраекце замацавана ўстанаўленне шматлікіх прававых наступстваў прымянення амністыі да асоб, асуджаных да пакарання ў выглядзе абмежавання і пазбаўлення волі. Прадугледжана скарачаць тэрмін пакарання на адзін год жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, не пазбаўленых бацькоўскіх правоў, за здзяйсненне злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. Таксама амністыю плануецца прымяніць да шматдзетных жанчын, якія маюць трое і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, не пазбаўленых бацькоўскіх правоў, асуджаных за здзяйсненне злачынства, спалучанага з забойствам або прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або смерць. Як і ў папярэднім Законе «Аб амністыі», прапануецца скарачаць тэрмін пакарання на адзін год за здзяйсненне злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў і псіхатропаў, іх прэкурсораў і аналагаў, асобам, якія здзейснілі злачынства да 18 гадоў. Прапаноўваецца скарачаць тэрмін пакарання на адзін год асобам, якія здзейснілі карупцыйныя злачынствы з канфіскацыяй».

Такім чынам, ад пакарання плануецца вызваліць або вызваліць умоўна, а таксама замяніць пакаранне больш мяккім каля пяці тысячам асуджаных. Адначасова прапаноўваецца скарачаць тэрмін пакарання на год 2850 асуджаным іншых катэгорый.

Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ**, амністыя з'яўляецца гуманнай і справядлівай мерай. «І пры добрых паводзінах можна выкарыстаць гэтую меру гуманных адносін дзяржавы да сваіх грамадзян», — дадаў ён.

Якія яшчэ законапраекты адобрылі сенатары, раскажам у найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».

**Вераніка КАНЮТА.**

# НІХТО НЕ ЧАКАЎ БЯДЫ...

## Моцная бура ў Зэльвенскім раёне стала прычынай смяротнага траўміравання жанчыны

**Мінулыя суткі для жыхароў Гродзенскай вобласці выдаліся экстрэмальнымі. У выніку моцнай буры ў 73 населеных пунктах Ваўкавыскага, Дзятлаўскага, Зэльвенскага, Навагрудскага, Карэліцкага і Астравецкага раёнаў было парушана электразабеспячэнне. Эпіцэнтрам урагану стаў Зэльвенскі раён, дзе вецер зрываў з дамоў дахі і валіў дрэвы. У выніку падзення дрэва загінула жанчына.**



Трагедыя адбылася на беразе Зэльвенскага вадасховішча вечарам 19 чэрвеня. Па папярэдняй інфармацыі, сям'я з Ваўкавыскага раёна адпачывала на вадаёме. Каля шасці гадзін вечара падняўся моцны шквалісты вецер. Каб не дапусціць падзення палаткі, у якой знаходзілася дзіця, сужэнцы некаторы час яе трымалі. У нейкі момант 42-гадовая жанчына адышла ад палаткі і трапіла пад дрэва, якое падала.

Падраздзяленні МНС, якія прыбылі на месца, распілавалі паваленае дрэва і выцягнулі пацярпелую. Да прыбыцця брыгады хуткай медыцынскай дапамогі праводзіліся рэанімацыйныя мерапрыемствы. Аднак гэта не дапамагло, і медработнікі канстатавалі смерць жанчыны. Яе муж і дзіця не пацярпелі.

Па інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, у выніку моцнага ветру ў шасці населеных пунктах Зэльвенскага і Слонімскага раёнаў пашкоджаны дахі амаль паўсотні жылых дамоў і 23 пабудоў. Найбольш значныя разбурэнні адбыліся ў вёсцы Беражкі, дзе назіралася лакальнае ўзмацненне ветру.

Сарваны дахі 35 жылых дамоў, з-за паваленых дрэў адбылося частковае пашкоджанне ліній электраперадачы, што прывяло да адключэння электраэнергіі ў дамах і фермах. Зафіксаваны факты падзення дрэў на чыгуначныя пуці і аўтамабільныя дарогі.

Ураган доўжыўся нядоўга. Па словах мясцічаў, усё пачалося пасля шасці часоў вечара. Нічога не было відаць, акрамя суцэльнага патоку вады. Раптоўна ўзнікаў шквалісты вецер. На вачах у людзей валіліся дрэвы, зрывала з дамоў дахі. Хаця, па словах відавочцаў, нічога не прадракала бяды. Ішла звычайная хмара. Праўда, у некаторых гаспадароў у дом сталі прасіцца сабакі. Потым вецер памацнеў, валіліся дрэвы, пайшоў град.

На месца стыхіі ў Зэльвенскі раён прыехала кіраўніцтва вобласці, быў разгорнуты штаб па ліквідацыі наступстваў надзвычайнай сітуацыі, які ўзначаліў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** Дзякуючы прынятым мерам рэагавання, аператыўна аднаўлены аўтамабільны і чыгуначны рух. Падрыхтавана 20 месцаў для размяшчэння грамадзян, чые дамы найбольш пашкоджаны стыхіяй. Устанаўліваецца аб'ём страт.

На працягу мінулага дня вяліся работы па ліквідацыі наступстваў стыхіі: расчыстка пад'язных дарог, вырубка небяспечных дрэў, аднаўленне лініі электраперадачы. Прымаюцца неабходныя меры па аказанні дапамогі людзям, якія пацярпелі ад урагану. На месцы здарэнняў накіраваны прадстаўнікі «Белдзяржстраха», каб цалкам і аператыўна ацаніць страты, афарміць усе дакументы.

Разгорнута работа па аказанні дапамогі пацярпелым. Паўтары тысячы лістоў шыферу прадставіць Зэльвенскі раён. Больш чым 30 тысяч ёсць у рэзервовым запасе на прадпрыемстве «Краснасельскбудматэрыялы». Па словах Уладзіміра Караніка, людзям будзе аказана дапамога не толькі будаўнічымі матэрыяламі, але і працоўнай сілай. «Важна максімальна аператыўна ўсё жыллё нашых грамадзян прывесці ў прыдатны для пражывання стан», — зазначыў губернатар.

За кароткі перыяд у населеных пунктах адноўлена падача электраэнергіі. У тым ліку ў дзіцячы летнік, які знаходзіцца за восем кіламетраў ад эпіцэнтра стыхіі. На шчасце, ні дзеці, ні летнік не закрануты штормам. Энергетыкі працягваюць работы па падключэнні спажыўцоў электраэнергіі. У зону навальніцы накіравана 15 рамонтна-эксплуатацыйных і аператыўна-выязных брыгад і спецтэхніка.

Спецыялісты Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС папярэджваюць аб правілах паводзін падчас урагану і навальніцы. Найлепш пераждаць непагадзь у кватэры. Гарадскія дамы абаронены ад маланак, але вокны ўсё роўна варта зачыніць — на выпадак шаравой маланкі. Таксама лепш выключыць з сеткі электрапрыборы. Перапады напружання электрасеткі могуць прывесці ў згаранне. Пажадана адкласці гаворку па мабільным тэлефоне, а таксама водныя працэдуры.

Калі навальніца заспела на адкрытым участку, на полі, трэба пашукаць паглыбленне ці невялікі яр. Калі іх няма, тады трэба проста легчы на зямлю. Варта заняць максімальную плошчу паверхні, а не ўзвышацца над ёй.

Таксама трэба абыходзіць бокам асобныя дрэвы. У лесе трэба трымацца далей ад высокіх дрэў. Асабліва ад дуба, які мае добрую электраправоднасць. Пад дрэвамі лепш не стаяць. Аптымальны варыянт — схавацца ў якой-небудзь канаве. Таксама можна перачакаць навальніцу ў аўтамабілі, але не рухацца, а пастаяць у бяспечным месцы, дзе няма высокіх дрэў. Варта памятаць, што пры набліжэнні навальнічнага фронту трэба як мага хутчэй пакпапацца аб бяспецы і не рызыкаваць сваім жыццём і жыццём блізкіх.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Стыхія

# Пасля непагадзі

У Мінскай вобласці пашкоджанні лясного фонду адзначаны ў Бараўлянскім спецлясгасе, Мінскім і Валожынскім лясгасах. Паводле папярэдніх звестак, у Бараўлянскім спецлясгасе пацярпелі Калодзішчанскае і Ратамскае лясніцтвы. Праведзенне суцэльных санітарных высечак патрабуецца на плошчы каля 7 гектараў, выбарачных санітарных высечак і прыборкі захламленасці — на каля 30 гектарах. У Валожынскім лясгасе пацярпела Ракаўскае лясніцтва. Па папярэдніх даных, у асноўным патрабуецца прыборка захламленасці, без суцэльных санітарных высечак. У Заслаўскім лясніцтве Мінскага лясгаса суцэльная санітарная высечка будзе праведзена на плошчы 0,4 гектара.

У сталіцы 19 чэрвеня за гадзіну, з 18:30 да 19:30, выпала 23,4 міліметра ападкаў пры сярэднямесячнай норме 89 міліметраў. У выніку непагадзі былі падтоплены два ўчасткі дарог. Затрымка ў руху шасці тралейбусных і аднаго аўтобуснага маршрутаў склала да адной гадзіны 17 хвілін.

Беларуская чыгунка паведаміла, што ў выніку моцнага дажджу і падзення дрэў на чыгуначныя пуці былі затрыманы 26 пасажырскіх цягнікоў у Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. Затрымка склала да 2,5 гадзіны.

У выніку навальнічнага фронту і моцнага ветру зафіксаваны 73 выпадкі падзення дрэў у Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцях і ў Мінску. Паваленымі дрэвамі пашкоджана пяць аўтамабіляў у Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.

Работнікамі МНС і іншых арганізацый у чацвер працягваліся работы па распілоўцы і прыборцы паваленых дрэў.

У «Белэнерга» ў чацвер паведамілі, што на працягу апошніх сутак у Беларусі перыядычна парушалася электразабеспячэнне ў 571 населеным пункце (Брэсцкая вобласць — чатыры, Віцебская — 147, Гомельская — два, Гродзенская — 91, Мінская — 324, Магілёўская — 3), 28 сельскагаспадарчых будынках і 1979 трансфарматарных падстанцый.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# 37 тысяч лёсаў за незалежнасць

## САВЕЦКАЯ МУЖНАСЦЬ І КЕМЛІВАСЦЬ

За тры гады акупацыі фашысты ператварылі Оршу ў магутны вузел абароны. Паўсюль былі створаны абарончыя ўмацаванні на 25—30 кіламетраў ад пярэдняга краю. Траншэі ўзмацняліся дотамі, дзотамі, драцянымі загародамі, супрацьпяхотнымі і супрацьтанкавымі міннымі палямі. У самім горадзе да абароны былі прыстасаваны ўсе каменныя будынкі, а вуліцы акапаны равамі. Для будаўніцтва абарончага вала «Пантэра» былі разабраны тысячы жылых дамоў і пабудоў... На кожны ўчастак фронту ў раёне ад Дуброўна да Копысі на адзін кіламетр прыходзілася 500 штыкоў асабістага саставу, 50 кулямётаў і 22 гарматы ворага. Немцы пастаянна ўдасканальвалі сістэму агню, прастрэльваючы кожны метр зямлі перад сваім пярэднім краем. Тэарэтычна тут немагчыма было ні прайсці, ні прапаўзці, ні праляцець.

Нашы байцы змаглі абхітрыць фашыстаў і пайшлі ў абыход магутных умацаванняў па балоцістай мясцовасці. У выніку савецкія воіны раздзялілі флангі Аршанскай і Віцебскай груповак фашыстаў і вымусілі іх рухацца па Мінскай дарозе, а там ужо падключылася авіяцыя...

З раніцы 26 чэрвеня ў палассе 5-й арміі была ўведзена ў прарыў 5-я гвардзейская танкавая армія, якая пачала прасоўвацца ў напрамку Талачын і Барысаў, што палегчыла ахоп нямецка-фашысцкіх войскаў у Оршы. Адначасова нашы часці нанеслі ўдар з усходу, адразу фарсіравалі Днепр і выйшлі ў цэнтральныя кварталы горада. Рухаючыся з баямі па гарадскіх вуліцах, на досвітку захапілі чыгуначную станцыю, якая была замініравана. 27 чэрвеня войскі 3-га Беларускага фронту вызвалілі Оршу.

Пасля вызвалення горада савецкім войскам была адкрыта дарога на Мінск. Больш за 40 частак і злучэнняў, байцы якіх праявілі мужнасць і гераізм, атрымалі ганаровае найменне «Аршанскіх». У 1984 годзе Орша, якая пасля вайны аказалася амаль сцёртай з твару зямлі, была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны І ступені, а ў 2009 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

## НАВЕЧНА ПОДЗВІГІ Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

Пры вызваленні Оршы званне Героя Савецкага Саюза атрымаў радавы Юрый Смірноў, якога па-зверску закатавалі фашысты. 19-гадовы хлопец працаваў токарам, мог не ісці на вайну, а заставацца ў тыле. Аднак свой выбар зрабіў, як і яго старэйшыя браты: ваяваў у складзе 77-га гвардзейскага стралковага палка 26-й гвардзейскай стралковай дывізіі 11-й гвардзейскай арміі Беларускага фронту. 24 чэрвеня 1944 года ў рамках аперацыі «Баграціён» камандаванне загадала арганізаваць танкавы дэсант, перад якім стаяла задача атакаваць абарону праціўніка ў фланг і тыл, авалодаць вёскай Шалашына і перарэзаць шашу Мінск — Масква. Удзельнікаў разведкі боем адбіралі толькі з добраахвотнікаў 77-га гвардзейскага стралковага палка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля цяжкага ранення Смірноў мог не ўдзельнічаць у аперацыі, ніхто не прызнаў бы яго баязліўцам, аднак хлопец заняў месца на браніраванай машыне № 119. Варожая куля сарвала яго з танкавай брані, ён упаў на ўскрайку гаю каля вёскі Шалашына недалёка ад штабных бліндажоў 78-й нямецкай штурмавой дывізіі. Яго падабралі немцы, доўга катавалі і здзекваліся. Калі юнак не сказаў ні слова, яго, парэзанага і беспрытомнага, распялі на сцяне бліндажа 25 чэрвеня. У гэты час ужо ішлі наступальныя баі савецкіх войск, сярод параненых Смірнова не знайшлі, сярод забітых таксама. Калі ў нямецкім бліндажы на сцяне было знойдзена прыбітае цвікамі цела з выразанай на грудзях зоркай, пазнаць Юрыя было немагчыма. Падчас адыходу немцы паспешліва пакінулі на стале пратакол допыту, які стаў адзінай зачэпкай у пошуку салдата. Ён пахаваны ў Арэхаўску Аршанскага раёна, а ў вёсцы Шалашына стаіць памятны знак у гонар подзвігу Героя Савецкага Саюза.



Гвардыі лейтэнанту Сяргею Міхайлавічу Міту 26 чэрвеня 1944 года было загадана авалодаць пераправай праз раку Адроў. Пад прыкрыццём агню роты танкаў лейтэнант уварваўся першым у абарону праціўніка, на поўнай хуткасці савецкі экіпаж раздушыў калону ворага, ператварыўшы яе ў месіва. Памятаючы загад, Сяргей Міт з узводам танкаў прарваўся да пераправы, якую ахоўвалі восем самаходных гармат і батарэя палявых гармат. Пры падтрымцы агню роты танкаў узвод спаліў пяць варожых самаходак, а тры машыны немцы кінулі спраўнымі. Недалёка ад пераправы варожы снарад прабіў танк лейтэнанта Міта, і ён загарэўся. Герой-танкіст накіраваў свой падпалены танк на мост у надзеі праскочыць праз яго і разагнаць падрыўнікоў. Выбухнулі снарады, экіпаж загінуў, але пераправа была ўзята. Пасмяротна Сяргею Міхайлавічу прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Гераічны экіпаж пахаваны ў вёсцы Смальяны Аршанскага раёна, у вёсцы Роскі Сялец таго ж раёна імя Героя носіць мясцовая школа.

Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў пакінуў у пераможным летапісе Аршаншчыне значны след. Камандуючы ўсімі партызанскімі сіламі аршанскай зоны, разам з членамі падпольнай групы за тры месяцы пусціў пад адхон больш за 100 нямецкіх цягнікоў. У 1942 годзе Заслонаў стаў камандзірам партызанскай брыгады, якая з яшчэ адной брыгадай знішчылі больш за сем тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. «Чыгуначны партызан» загінуў у няроўным баі каля вёскі Купаваць Сенненскага раёна ў 1942 годзе, быў смяротна паранены. На сёння больш за 70 гарадоў Беларусі маюць вуліцы, якія носяць імя легендарнага камандзіра. Ёсць такія вуліцы ў Санкт-Пецярбургу і Новасібірску. Памяць аб Героі Савецкага Саюза жыве ў Оршы ў назве вуліцы, станцыі, у 1948 годзе тут быў адкрыты мемарыяльны музей імя Заслонава.

Французскі лётчык Марсэль Лефеўр ваяваў у знакамітай эскадрыллі «Нармандыя-Нёман», удзельнічаў у Віцебска-Аршанскай, Усходне-Прускай і Кёнігсбергскай аперацыях. У небе пад Оршай у чэрвені 1944 года яго самалёт быў падбіты і загарэўся. У лётчыка быў парашут, і ён мог бы пакінуць падпаленую машыну, але Лефеўр разумеў, што наступ толькі пачаўся, што будуць цяжкія баі за вызваленне Беларусі і таму ўлічваецца кожная баявая машына. Ён вырашыў выратаваць самалёт і павёў яго да свайго аэрадрома. Праз некалькі дзён, пасля рамонту, самалёт зноў падняўся ў паветра, а Марсэль Лефеўр загінуў ад цяжкіх апёкаў. За два гады баеў французскі лётчык здзейсніў 105 баявых вылетаў, правёў 30 паветраных баёў, збіў 11 самалётаў праціўніка. Лефеўр атрымаў званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна, што было для замежных байцоў вялікай рэдкасцю.

Беражліва захоўваюць памяць аршанцы і аб Ганне Аляксееўне Нікандравай. Недалёка ад Оршы, у вёсцы Кірэева Дубровенскага раёна пры прарыве абароны праціўніка полк, у якім ваявала Аня, трапіў пад моцны агонь ворага. Некалькі разоў пачыналася атака, і кожны раз яна захлыналася пад жорсткім агнём фашыстаў, ужо былі параненыя камандзір і камісар палка. І тады наперад з крыкам: «За мной, арлы!» — выбегла 24-гадовая Нікандрава. Байцы, убачыўшы наперадзе юную дзяўчыну, з апошніх сіл падняліся ў атаку. Вораг быў выбіты з вёскі, абарона была прарвана, а Ганна Аляксееўна ў гэтым баі была цяжка паранена і ў чэрвені 1944 года памерла ў шпіталі. Пасмяротна адважнай дзяўчыне было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Гэтыя асобы — толькі невялікая частка з пераліку гераічных людзей, якія вызвалялі Аршанскі раён. Іх імёны ўвекавечаны ў парку Герояў, дзе ў кожнага — свая алея. А шостая, галоўная, носіць імя Невядомага салдата ў гонар усіх вызваліцеляў, якія пакуль застаюцца безыменнымі. У парку Герояў размешчаны Курган неўміручасці, які быў узведзены ў 1966 годзе. Каля яго паднножжа — адзін з першых вечных агнёў у Беларусі, полымя якога не згасае 58 гадоў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

Неасабісты суб'ектыў



# НА ЎЗРОЎНІ ДНК

## У кожнага свая вайна. Нават праз восемдзесят гадоў

МАЙСКІ водпуск пачаўся з паездкі ў Дзяржынск — трэба было павырашаць пытанні па вясковай хаце. Аўтобусы там ходзяць рэдка, дый не ўсюды — адлегласці зусім невялікія, давялося ў «энергазбыт» на ўскраіне горада ісці пешшу. Па нешырокай вуліцы прыватнага сектара, над якім лунаў пах бэзу, міма касцёла, які нядаўна адбудавалі пасля пажару, і рэштак колішняга кальвінскага збору. Міма чорных фігур, якія стаяць спінай да дарогі, тварам да помніка, да сцяны. Яны з'явіліся тут нядаўна, літаральна год назад. Раней быў толькі помнік. А на пачатку 90-х зусім побач былі грады з бульбай. І пасвіліся навязаныя козы. Цяпер вакол пустка. Толькі чорныя фігуры, што стаяць спінай да дарогі. Адразу, нават не ведаючы, зразумееш: гэта яўрэі. Мужчына са скруткам Торы на плячы, жанчына, якая трымае яго пад руку. Нібы выправіліся кудысьці ў дарогу і спыніліся. Яшчэ некалькі фігур, таксама ідуць з імі ў той жа шлях. Трэба падысці зазірнуць ім у твары. Абавязкова трэба падысці...

Я збочыла з вуліцы і па заасфальтаванай дарожцы пайшла да фігур. Зазірнула ім у твары — і жахнулася. Твараў не было. У іх увогуле няма аб'ёмнай пярэдняй часткі — роўная бліскучая паверхня. Сказаць, што гэта ашаламляе, — нічога не сказаць. Я стаяла, сама акамянелая, і адчувала, як раптам чамусьці стала не хапаць гэтага празрыстага бэзавага паветра, якім дагэтуль з задавальненнем дыхала на поўныя грудзі. Я стаяла разам з імі на краі іхняй магілы. Якую калісьці ім пад дуламі аўтаматаў літоўскіх паліцаяў капала разам з іншымі мая бабуля. Я ведала гэта даўно — і пра бабулю, і пра тое, што на гэтым месцы фашысты ўвосень 41-га расстралялі ўсю койданаўскую абшчыну — амаль 1600 чалавек. Але гэта ўспрымалася як частка агульнай пакутніцкай гісторыі маёй краіны. І раптам гэта стала гісторыяй маёй асабістай. Вайна дагнала мяне тут, у горадзе, знаёмым з дзяцінства, яна накрыла мяне сваёй шчыльнай чорнай пялюшкай і не давала дыхаць. Я хадзіла ля той праклятай сцяны, гладзіла незвычайныя імёны, напісаныя на таблічках, плакала і прасіла ў іх прабачэння. За тое, што мая бабуля выжыла тады, за тое, што я нарадзілася...

БАБУЛЯ памерла рана, калі мне было ўсяго восем гадоў. Я не магла тады нічога распытаць, а яна сама пра вайну нам, малым, нічога не расказвала. Пра тое, што яе, 19-гадовую, ганялі з родных Кукшавіч у Дзяржынск капаць тую страшную яму, я ведала ад мамы. Без дэталяў і падрабязнасцяў. За тры гады акупацыі жудасных падрабязнасцяў было столькі, што, калі б усё згадваў і асэнсоўваў, можна было б звар'яцець. Яна з дваімі маленькімі дзецьмі была сям'ёй чырвонага камандзіра (дзед, калі пачалася вайна, вучыўся ў артылерыйскім вучылішчы ў Баку, адтуль і пайшоў на фронт), і гэта проста шчасце, што сярод аднавяскоўцаў не знайшлося здраднікаў, што ніхто не данёс пра гэта немцам...

АЛЕ цяпер гэта стала маёй асабістай гісторыяй. І я пачала шукаць сведчанні. І знайшла. «Са сведчанняў жыхара г. Дзяржынска Міхаіла Бушылы: «Раніцай немцы прыйшлі ў калгас імя «9 студзеня 1905 года» і запатрабавалі рабочых з рыдлёўкамі капаць яму. Калі ўсё было гатова, рабочых адвялі за груд метраў за 30—40 і паклалі на зямлю. Да гэтага часу ўся мясцовасць на 200—300 метраў вакол была ачэпленая ўзброенымі немцамі. Карнікі, акрамя таго, хадзілі па дамах і загадвалі не выходзіць на вуліцу. Неўзабаве пачалі падводзіць яўрэяў групамі па 15—20 чалавек. Іх распраналі і кідалі жывымі ў яму. Затым па іх пачыналі страляць літоўцы з нямецкага карнага атрада, якія стаялі па абодвух краях гэтай вялізнай магілы. У момант расстрэлу я знаходзіўся на калгаснай стайні і асабіста ўсё бачыў». Са сведчанняў жыхара г. Дзяржынска Дзмітрыя Шыбута: «У кастрычніку 1941 года ў калгас прыйшлі літоўцы з карнага атрада і ўзялі 60 калгаснікаў капаць яму. Пазней мы даведаліся, што яна прызначаная для яўрэяў. Да нас на дапамогу даслалі яшчэ 60 палонных. Гадзіны за чатыры яма даўжынёй 15 метраў, шырынёй 4 метры і глыбінёй 2,5-3 метры была гатова. Пасля гэтага нас пад канвоем адвялі метраў за 300 і пасадзілі спінай да ямы. Прасядзелі мы так каля дзвюх гадзін, былі чутны стрэлы, плач, крыкі, стогны. Затым нас пагналі закопваць яму, якая цалкам была напоўнена расстралянымі яўрэямі».

19-гадовая Надзя Клімовіч была адной з тых 60-ці, якія бачылі гэты кашмар, якія супраць сваёй волі былі ў нейкай ступені яго ўдзельнікамі. Тое, што перажыла яна, канешне, не ідзе ні ў якое параўнанне з апошнімі хвілінамі забітых там людзей. Але і пакаранне ёй за тое, што яны — забітыя, а яна — жывая, дасталася страшнае — веданне і памяць. На ўсё нядоўгае жыццё. А яшчэ вось гэта пачуццё віны, якое, напэўна, тады, восенню 41-га пасялілася ў яе генах і перадалося ў спадчыну на ўзроўні ДНК унукам, якія нарадзіліся праз дзесяцігоддзі пасля вайны.

НЯРЭДКА кажуць: мала якую сям'ю ў Беларусі не закранула вайна. Няправільна. Нават калі ў тым пекле ў сям'і засталіся ўсе жывыя, вайна ўсё роўна не прайшла міма. Мы ўсе — нашчадкі тых дваіх, якія выжылі з траіх, — яе ахвяры. Яна даганяе, накрывае нас нават праз восемдзесят гадоў. Яна — наша вечная родавая траўма, якую не лечыць час.

І, гледзячы на кашмар, ужо сучасны, што адбываецца вакол, ловіш сябе на думцы: добра, што яно так, а не інакш.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Сядзі і глядзі

# Жыве памяць па кожным трэцім

**Заўтра, 22 чэрвеня, у Палацы Рэспублікі адбудзецца канцэрт-рэквіем «Кожны трэці». Сёлета, калі мы адзначаем 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — гэта адно з тых мерапрыемстваў, якія нагадваюць пра важнае і галоўнае: якой цаной дасталася нам мірнае неба.**

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў нашай краіне пад нямецкай акупацыяй апынуліся каля васьмі мільёнаў жыхароў і каля 900 тысяч савецкіх ваеннапалонных. А ў межах рэспублікі было створана 588 месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва, у тым ліку 14 канцэнтрацыйных лагераў для дзяцей. І за гады варожай акупацыі на тэрыторыі Беларусі знішчылі не менш чым 12 348 населеных пунктаў... Доўгі час лічылася, што на нашых землях загінуў кожны чацвёрты, але ўдакладненыя на працягу апошніх гадоў даныя сведчаць пра тое, што Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара. І расследаванне злачынстваў фашысцкіх акупантаў працягваецца.

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» — даніна памяці ўсім ахвярам і героям Вялікай Айчыннай вайны, расповед пра лёсы простых людзей, сінтэз новых песень пра вайну і перамогу з унікальнымі кадрамі хронікі, гістарычных фактаў. У першай частцы канцэртнай праграмы прадстаўлены даныя пра назаўсёды страчаныя населеныя пункты, пра Герояў Савецкага Саюза, а таксама ўзнімаецца тэма генацыду мірнага насельніцтва. Прадстаўлены будуць рэдкія кадры хронікі, фотадакументы. У другой частцы галоўнай стане тэма адказнасці сучаснікаў за захаванне гістарычнай памяці і традыцый. Пазтычную аснову складае «Рэквіем па кожным чацвёртым» А. Вярцінскага. У канцэрце прагучаць як шырока вядомыя, так і новыя творы сучасных беларускіх аўтараў Валерыя Шмата, Ганны Сялук, Ганны Благавай, Яўгена Алейніка і іншых. Рэжысёрам праекта выступае мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіслава Арцюкоўская. У падрыхтоўцы канцэрта прымалі ўдзел «Музычная медыякампанія», Белтэлерадыёкампанія, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Мінгарвыканкам.

І ў кожнага, хто таксама хоча аддаць даніну памяці гераічнаму мінуламу нашай краіны, будзе магчымасць убачыць тэлеверсію канцэрта-рэквіема «Кожны трэці» 23 чэрвеня ў 19.15 у эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 220

29—31 мая ў Гомелі прайшла X Міжнародная спартакіяда сярод ветэранаў і кіраўнікоў раённых ветэранскіх арганізацый фізічнай культуры і спорту, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі. У спаборніцтвах па шашках перамаглі Генадзь Барысаў (Віцебская вобласць) і Раіса Новікава (Мінская вобласць). 1—2 чэрвеня ў Віцебску праходзіў адкрыты турнір па шашках-64, прысвечаны Герою Савецкага Саюза А. К. Гараўцу. У рамках спаборніцтваў былі тры турніры для шашыстаў рознай кваліфікацыі. У асноўным перамог Анатоль Камовіч.

З 4 да 7 чэрвеня ў Гомелі пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь адбыліся міжнародныя камандныя спаборніцтвы па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат 2008 г. н. і маладзей «Юныя зоркі». У спаборніцтвах прынялі ўдзел 14 каманд. Перамаглі шашысты Масквы, на другім месцы — Арлоўская вобласць, «бронзу» выйгралі шашысты Віцебскай вобласці.

№ 93



Сёння прапаноўваюцца дамачныя кампазіцыі, складзеныя вядучым рубрыкі.

**№ 93**

**Белыя простыя:** g1, f2, a3, c3, g3, b4, f4, e5, дамка d4 (9)

**Чорныя простыя:** h2, h4, a5, d6, f6, a7, c7, g7, дамка e7 (9)

1. b4-c5 d6:d2 2. d4-b6 a7:c5 3. e5-d6 c7:e5 4. f4:c1 h2:f4 5. c1:b4 a5:c3 6. f2-g3 h4:f2 7.g1:e3 +

**№ 94**

**Белыя простыя:** e1, c3, e3, c5, g5, h6, дамка a3 (7)

**Чорныя простыя:** h2, g3, h4, e5, f6, c7, e7, g7, f8 (9)

1. c3-d4 e5:c3 2. e3-f4 g3:e5 3. c5-d6 e7:c5 4. a3:g3 h2:f4

[ 4...h4:f2 5.g5:e7 f8:d6 6.e1:g3 h2:f4 7.h6:g5 ]

5. g5:e7 f8:d6 6. h6:h6 h4-g3 7. h6-e3 g3-h2 8. e3-g1 c7-b6 9. g1:a7 h2-g1 10.e1-f2+

**№ 95**

**Белыя простыя:** a3, g5,d6,h6, дамка c5 (5)

**Чорныя простыя:** d2, f2, c3, e3, f4, h4, f6, e7, g7, b8, f8 (11)

1. a3-b4 c3:a5 2. c5-a3 e7:c5 3. a3:b4 a5:c3 4. g5:e7 f8:d6 5. h6:f4 b8-a7 6. f4-c7+

**№ 96**

**Белыя простыя:** b2, d2, c5, g5, d6, h6, дамка f4(7)

**Чорныя простыя:** f2, h4, f6, g7, f8, дамка e7 (6)

1. c5-b6 e7:a7 2. g5:e7 f8:d6 3. h6:g1 a7-b8 4. g1-h2+

**№ 97**

**Белыя простыя:** 48, 49, 43, 44, 40, 27, 28, 29, 22, 23 (10)

**Чорныя простыя:** 34, 25, 12, 13, 14, 15, 8, 10, дамка 18 (9)

1.22-17 12:32 2.23:03 34:45 3.03:20 15:22 4.44-40 45:34 5.43-39 34:43 6.49:09 10-14 7.09:20 25:14 8.48-43+

**№ 98**

**Белыя простыя шашкі:** 27, 28, 29, 17, дамка 26 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 40, 30, 18, 12, 14, 8, 10 (8)

1.29-23 12:32 2.26:45 18:29 3.45:05 32:23 4.05:49+

**№ 99**

**Белыя простыя шашкі:** 43, 28, 23, 17, 18, дамкі, 38, 6 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 41, 40, 31, 20, 9, 10, дамка 24 (7)

1.18-13 09:29

[ 1...24:21 2.38:47 21:49 3.47-33 40-45 4.33-50 ]

2.28-23 29:18 3.38-42 24:47 4.43-38 47:11 5.06:22 40-45 6.22-50+

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграваюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 219 ад 07.06.24.

**№ 87** лег. 1.eb4 ae7 исх. 1. c7-b8 g3:e1 2. g1-f2 e1:d6 [ 2... e1:c7 3. b8:f4 a5:c7 4. f4:b8 ]

[ 2...a5:c7 3. b8:f4 e1:g3 4. f4:h2 ] 3. b8:f8 a5:c7 4. f8:b8+

**№ 88** лег. 1. eb4 ae7 исх. 1. c7-b8 g3:e1 2. g1-f2 e1:d6 [ 2... a5:c7 3. b8:f4 ]

3. b8:f8 a5:c7 4. f8:b8+

**№ 89** 1. d2-c3 b2:f6 2. c7-b8 g3:e1 3. g1-f2 e1:g3 4. b8:h2 a5:c7 5. h2:b8+

**№ 90** 1. d2-e3 f4:b4 2. b2-a3 e5:g7 3. a3:e7 f8:d6 4. h6:f8 d6-e5 5. f8-g7 e5-f4 6. g7:c3 f4-g3 7. c3-d4 g3-h2 8. d4-g1+

**№ 91** 1. d4-c5 d6:d2 2. f2-e3 h4:d4 3. b2-c3 d2:b4 4. a3:e7 f8:d6 5. h6:f8+

**№ 92** 1. a7-b8 f4:b4 2. b8:f8 b4-c3 3. f8-b4 a3:e3 4. b2:f2+

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013»*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Анонс

# ЯРКАЕ ЖЫЦЦЁ ЛІЗЫ ЧАЙКІНАЙ, ЖАНОЧАЯ СІЛА І ПАЛЁТЫ НАТХНЕННЯ

## Што пачытаць у чэрвеньскім нумары «Алесі»?




### «ЗА МОЦНЫМ ЛІДАРАМ ХОЧАЦЦА ІСЦІ»

Дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа рамесніцтва і дызайну імя М. А. Кедышкі, адна з пераможцаў конкурсу «Жанчына года — 2023» у намінацыі «Паспяховы кіраўнік», дэлегат Усебеларускага народнага сходу Ганна Бойка ўпэўнена: да кожнай пачатай справы трэба ставіцца так, нібыта яна лёсавызначальная, а кіраўнік абавязаны быць наперадзе ва ўсім. Што матывуе на дасягненне мэт? Пры якіх умовах жанчына адбудзецца як лідар? Пра свае прынцыпы кіраўніка, крыніцы невычэрпнай энергіі і вялікую любоў да Радзімы Ганна Уладзіміраўна расказала ў інтэрв'ю «Алесі».

— За моцным лідарам хочацца ісці, — упэўнена Ганна Бойка. — А мацней за ўсё прыцягвае вера ў сваю справу, сапраўдная любоў да таго, чым займаешся.

### ЖЫЦЦЁ, ЯКОЕ СТАЛА ПОДЗВІГАМ

